Все эти различия позволяют говорить о том, что, несмотря на многие общие черты, холдинговая компания и ФПГ – это два различных типа объединения предприятий.

ЛИТЕРАТУРА

1. Валитов Ш. М. Холдинг: особенности организации и механизм функционирования. – Казань: КФЭИ, 1996.

2. Горбунов А.Р. Дочерние компании, филиалы, холдинги. 2 изд. – М.: Анкил, 1999.

УДК 338 (476)

У.У. Валетка, асістэнт

## АСАБЛІВАСЦІ РЭСТРУКТУРЫЗАЦЫІ НАЦЫЯНАЛЬНАЙ ГАСПАДАРКІ БЕЛАРУСІ ВА ЎМОВАХ ТРАНСФАРМАЦЫЙНАГА ПЕРЫЯДУ

The main areas of research are specific features of industry restructuring process in Belarus in transition period. Those ones are: the primacy of the restructuring at the macro level in respect of restructuring at the micro level; the inconsistency of the technocratic illusions; the growing influence of the globalization process.

Сучасны свет не ведае больш эфектыўнай мадэлі эканомікі, чым рынкавая. Таму пераход ад планавай эканомікі да рынкавай з’яўляецца аб’ектыўна абумоўленым і ў Беларусі. Перыяд, на працягу якога адбываецца станаўленне рынкавых адносінаў у канкрэтнай краіне ці групе краінаў, мы і будзем называць трансфармацыйным перыядам. Трэба заўважыць, што трансфармацыйны перыяд у кожнай краіне на сучасным этапе развіцця сусветнай эканомікі можа мець свае адметныя рысы. Аднак існуюць агульныя неабходныя і дастатковыя элементы рэфармавання эканомікі, рэалізацыя якіх забяспечвае станаўленне (удасканаленне) рынкавых стасункаў: лібералізацыя гаспадарчых адносінаў; інстытуцыйныя пераўтварэнні і фарміраванне гаспадарчага парадку, які адпавядае прынцыпам рынкавай эканомікі; стабілізацыя фінансавых адносінаў і макраэканамічных параметраў; рэструктурызацыя вытворчасці.

Рэфармацыйныя пераўтварэнні па кожнаму з выдзеленых накірункаў трансфармацыйных зменаў у эканоміцы ўзаемаўплываюць як на эфектыўнасць асобных рэформаў, так і на выніковасць працэсу трансфармацыі ў цэлым. У сваю чаргу, трансфармацыйныя мерапрыемствы знаходзяцца пад неадназначным уплывам працэсу глабалізацыі сусветнай эканомікі, што можна адлюстраваць у выглядзе своеасаблівага «трансфармацыйнага тэтраэдра», што знаходзіцца ў сферы ўплыву глабалізацыі (мал.).

Лібералізацыя прадугледжвае: адмену дырэктыўнага планавання і скарачэнне дзяржаўных манаполіяў; канкурэнцыю, свабоду прадпрымальніцтва і раўнапраўе ўсіх суб’ектаў рынку; лібералізацыю знешняга гандлю і валютных аперацый; свабоднае цэнаўтварэнне і канвертацыю нацыянальнай валюты і г. д.

У выніку лібералізацыі закладваюцца асновы рынкавага самарэгулявання і канкурэнцыі як асаблівага механізму размеркавання рэсурсаў, стымулявання павышэння якасці прадукцыі, пераўтварэння плацёжаздольнага попыту ў асноўны рэгулятар дынамікі і структуры вытворчасці. Каб эканамічная свабода вяла да прагрэсу ўсяго грамадства, неабходна ўкараненне ў выніку інстытуцыйных пераўтварэнняў гаспадарчага парадку, які ўсталёўвае «правілы гульні». Гэта прыватызацыя і стварэнне сістэмы абароны правоў уласнікаў; фарміраванне рынкавых інстытутаў – незалежных банкаў, фон-

давых і працоўных біржаў, інвестыцыйных фондаў і г. д.; рэгламентацыя гаспадарчай дзейнасці – грамадзянскі, падатковы, інвестыцыйны, бюджэтны, працоўны, зямельны кодэксы, антыманапольнае заканадаўства і г. д.; дэцэнтралізацыя кіравання – развіццё інстытутаў рэгіянальнай і мясцовай улады, самакіравання.




Мал. Элементы працэсу рынкавай трансфармацыі

Паспяховасць рэформаў па ўсіх выдзеленых кірунках залежыць ад іх сістэмнасці і своечасовасці. Працягласць жа пераўтварэнняў залежыць як ад стартавых умоваў і трываласці новых рынкавых інстытутаў, так і ад наяўнасці макраэканамічнай стабілізацыі, у першую чаргу фінансавай. Стабілізацыя, лібералізацыя і ўкараненне рынкавых інстытутаў праводзяцца не проста дзеля рэформаў саміх па сабе, а з'яўляюцца ўмовай *эфектыўнай* структурнай перабудовы гаспадаркі і паляпшэння на гэтай аснове ўзроўню жыцця насельніцтва.

Рэструктурызацыя ў самым агульным сэнсе ёсць «змяненне структуры». У рынкавых умовах гэта перманентны працэс зменаў у структуры вытворчасці, перш за ўсё, на мікраўзроўні пад уплывам зменаў спажывецкіх пераваг. Таму ва ўмовах рынкавых стасункаў змены на мікраўзроўні актывізуюць і накіроўваюць змены на ўзроўні галінаў нацыянальнай гаспадаркі (на макраўзроўні). Ва ўмовах трансфармацыі першачарговай задачай з'ўляецца значная міжгаліновая рэалакацыя рэсурсаў, паколькі ў адсутнасці канкурэнцыі была сфарміравана структура вытворчасці, якая патрабуе вялікіх выдаткаў на падтрыманне яе збалансаванасці. Рэструктурызацыя на ўзроўні галінаў, такім чынам, уключае рэструктурызацыю на ўзроўні прадпрыемстваў і працэс пераліву рэсурсаў з аднаго сектара прамысловасці ў іншы, які ўжо існаваў ці новы. Эфектыўным жа механізм пераліву рэсурсаў можа быць толькі пры ўмове існавання арганізацыйных, макраэканамічных, інстытуцыйных характарыстык гаспадаркі, якія адпавядаюць прынцыпам рынку. Не менш важныя адпаведныя макраэканамічныя ўмовы (напрыклад, падатковае стымуляванне) і для актывізацыі рэструктурызацыі асобных прадпрыемстваў. Таму для перыяду трансфармацыі, асабліва пачатковага яго этапу, узнікае выснова аб першаснасці рэструктурызацыі гаспадаркі на макраўзроўні ў адносінах да рэструктурызацыі на мікраўзроўні. Такім чынам, неабходна разглядаць першаснасць рэструктурызацыі на макраўзроўні, з аднаго боку, як часовую з'яву, а з другога – як галоўную ўмову рэструктурызацыі на мікраўроўзні, якая пры ўсталяванні рынкавых адносінаў набывае перманентны характар і вызначае змест і сутнасць макрарэструктурызацыі. Безумоўна, працэсы рэструктурызацыі гаспадаркі ідуць адначасова на розных яе ўзроўнях, і пер-

шаснасць макрарэструктурызацыі носіць дыялектычны характар. Ігнараванне адзначанай вышэй асаблівасці на працягу 1995–2002 гг., калі на структурную перабудову прадпрыемстваў Беларусі разлічвалі, не ствараўшы адпаведных арганізацыйна-эканамічных умоваў, з'яўляецца адной з асноўных эканамічных прычынаў крызіснага стану прамысловасці сёння.

Другая асаблівасць працэсу рэструктурызацыі ў трансфармацыйных умовах – гэта няслушнасць ідэалізацыі экспартарыентацыі ў спалучэнні з тэхнакратычнымі ілюзіямі, у прыватнасці, пакуль не ўсталююцца рынкавыя адносіны. Безумоўна, у доўгатэрміновым перыядзе рост дабрабыту нацыі магчымы толькі на аснове павышэння прадукцыйнасці працы праз індустрыялізацыю. Хаця б толькі таму, што попыт на прамысловыя тавары і іх цана растуць нашмат хутчэй за попыт і цану сельгаспрадуктаў і сыравіны. Але ва ўмовах трансфармацыйнага акрэсу, калі яшчэ не працуюць рынкавыя механізмы рэгуляцыі структуры вытворчасці, узнікае дылема: «усюдыход або дарога?». Замест таго, каб пракласці «звыклую» дарогу, можа быць пабудаваны сучасны завод па вытворчасці ўсюдыходаў. З тэхнакратычнага пункта гледжання, магчыма, у гэтым выпадку прагрэсу больш. Але ў эканамічным аспекце такі варыянт занадта дарагі і бесперспектыўны, можа прыводзіць да абвастрэння наяўных дыспрапорцыяў. Празмерны разлік на «усюдыходы» прыводзіць да «выціскання таvараў ніжэйшых катэгорыяў, якія патрабуюць менш капіталу, але часта паглынаюць больш працоўнай сілы» [1]. У выпадку Беларусі вытворчасць г. зв. «усюдыходаў» засталася ў спадчыну ад СССР. Але сутнасці праблемы гэта не мяняе, толькі яе ўскладняе, паколькі інерцыйная падтрымка празмерных магутнасцяў змяншае шансы развіцця і росту канкурэнтаздольнасці як новых галінаў, так і традыцыйнага спажывецкага сектара. Яскравым прыкладам з'яўляецца харчовая прамысловасць Беларусі. Толькі за 2001 г. імпарт гатовых харчовых прадуктаў з Расіі павялічыўся на 50 млн. дал. – з 116,4 да 166,0 млн. дал., а ў параўнанні з 1995 г. – вырас у 19 разоў (з 8,7 млн. дал.). Прычым больш імпартаваць сталі не кавы ці тытуню, якія ў Беларусі не растуць. Так, імпарт хлебных і малочных вырабаў толькі з 1995 па 2000 г. павялічыўся ў 22 разы, прадуктаў перапрацоўкі садавіны і гародніны – у 55 разоў. Адначасова змяншаецца экспарт прадукцыі галіны. І пры гэтым развіццё сельскай гаспадаркі з'яўляецца прыярытэтам эканамічнай палітыкі. Назіраецца незбалансаванасць і ў палітыцы росту даходаў. Так, па даных Нацбанка, у 2001 г. насельніцтва набыло ў банках валюты на 390 млн. дал. больш, чым прадала, у 2002 г. – больш ужо на 480 млн. дал. Па ацэнках спецыялістаў, каля 80% гэтай валюты выдаткоўвалася на тавары харчовай і лёгкай прамысловасці. Такім чынам, пры складаным фінансавым стане эканомікі і цяжкасцях з ростам заробкаў штогод дадаткова 300–400 млн. дал. ідуць да замежных вытворцаў. У цэлым пры росце валавага ўнутранага прадукта (ВУП) за мінулы год на 4,7% рост вытворчасці спажывецкіх тавараў склаў 3,4%. Вырашэнне праблемы, канешне, не ў простым павелічэнні выпуску (пасля машынабудавання і хімічнай прамысловасці складскія запасы найбольшыя ў лёгкай і харчовай галінах), а ў неабходнасці якасна ўзнавіць асартымент прадукцыі, што немагчыма без інвестыцыяў. А адкуль будуць сродкі на інвестыцыі, калі звыш месяцовага выпуску прадукцыі знаходзіцца ў складскіх запасах, а банкаўскія крэдыты выкарыстоўваюцца на выплату заробкаў (у 2001 г. – 53% аб'ёму крэдытавання). Такім чынам, назіраем замкнёнае кола.

У процівагу можа быць выказана меркаванне, што патрэбы ў спажывецкіх таварах магчыма задаволіць за кошт экспартных даходаў. Але, як вядома, у апошнія гады бела-

рускі экспарт падтрымліваўся за кошт механізму дэвальвацыі нацыянальнай валюты пры змяншэнні ўнутранага попыту, бартэру (яго вага знізілася з 35,5% у 1999 г. да 18% у 2001 г.), пры росце вывазу сыравіны і прадуктаў перапрацоўкі нафты. Пры ўваходжанні ў сусветную гандлёвую арганізацыю (WTO), якое адбудзецца ўжо ў сярэднетэрміновай перспектыве, разлічваць на аднабаковыя і нярынкавыя спосабы росту экспарту не прыйдзецца. І канкурэнтаздольнасць таго ж машынабудавання пад вялікім пытаннем, паколькі нават у Расіі, куды накіроўваецца каля 80% прадукцыі галіны, штогод павялічваюць выпуск і трактароў, і тэлевізараў. Да таго ж беларуская мадэль росту экспарту не адпавядае ні еўрапейскай (экспарт расце пасля задавальнення ўнутраных патрэбаў), ні японскай мадэлі (адначасовае задавальненне ўнутранага і вонкавага рынку). Як піша Р. МакЛеод, прафесар Нацыянальнага аўстралійскага універсітэта, «калі няма скажэнняў сукупнага попыту, няма і асаблівых прычынаў аддаваць перавагу экспартаарыентаванаму росту перад ростам, арыентаваным на ўнутраны рынак» [2]. Можна меркаваць, што перавагі экспартарыентацыі будуць назірацца ў двух выпадках. Папершае, калі дынаміка вонкавага попыту істотна і ўстойліва апярэджвае дынаміку ўнутранага, г. зн. экспарт з'яўляецца важным фактарам пашырэння сукупнага попыту на нацыянальную прадукцыю. Па-другое, калі макраэканамічны мультыплікатар даходаў ад экспарту значна вышэйшы, чым ад вытворчасці на ўнутраны рынак, што магчыма толькі пры экспарце прадукцыі глыбокай перапрацоўкі і высокай інвестыцыйнай актыўнасці. У дастатковай ступені ў Беларусі не выконваецца ні адна з гэтых умоваў.

Што датычыць спасылак на навукаёмісты сектар прамысловасці, то, як паказвае статыстыка, падставаў для гэтага асаблівых няма. Так, з 1996 г. па 2001 г. аб'ём прадукцыі прамысловасці ўзрос амаль на 68%. Але пры гэтым удзельная вага ў экспарце прадукцыі высокай навукаёмістасці нават знізілася – у цэлым з 4% да 3,7%, а ў краіны па-за СНД увогуле больш за 2 разы (з 6,6% да 3,1%). У 2001 г. экспарт прадукцыі высокай навукаёмістасці ў СНД склаў 185,6 млн. дал. (4,1%), што вельмі нязначна. У той жа час павялічваецца імпарт з СНД прадукцыі нізкай навукаёмістасці (з 14 да 15,8%). Становіцца ясна, што развіццё навукаёмістага сектара ў Беларусі яшчэ наперадзе. Вызначыць яго канкрэтныя сферы можна толькі з дапамогай рынку, а зараз жа неабходна ствараць умовы для яго развіцця (змяншэнне падатковага ўціску, павышэнне навукаёмістасці ВУП, якая ў Беларусі складае 0,9%, а ў сярэднім па краінах Еўрасаюза – 2% ВУП).

Не менш важным выклікам для нацыянальнай гаспадаркі Беларусі з'яўляецца дастасаванне да ўмоваў і тэндэнцыяў глабальнай эканомікі. Беларусь мае структуру экспарту, якая амаль не змянілася з часоў СССР і носіць міжгаліновы характар (міжнародны гандаль прадукцыяй розных галінаў прамысловасці і сельскай гаспадаркі). Зараз жа звыш 70% міжнароднага гандлю з'яўляецца ўнутрыгаліновым (гандаль разнастайнымі вырабамі адных і тых жа галінаў), што звязана з рэалізацыяй эфекту маштабу і прамысловай спецыялізацыі [3]. Таму, каб Беларусь магла стаць стабільным звяном сусветных ТНК, павінны быць створаны ўмовы для адпаведнай рэструктурызацыі гаспадаркі. Гэта патрабуе ўзважанай прамысловай палітыкі, арыентаванай на ўсталяванне стабільных рынкавых механізмаў, прагматычнай і пазбаўленай ілюзіяў.

## ЛІТАРАТУРА

1. Transition report 1999. – London: EBRD, 1999. – P. 165–177.
2. Export orientation as the factor of development of new industrial countries economy. – Financial Times. – 2001. – 28 December. – P. 8–9.
3. Globalization, Growth and Poverty: Building an Inclusive World Economy. – Washington: World Bank, 2002. – 174 p.